Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 46 (115)
ПАНЯДЗЕЛАК
26 ЛЮТАГА 1940 г.

Цана 10 капеек

ВЯЛІКІЯ ПРАВЫ ВЫБАРШЧЫКАЎ НАШАЙ КРАІНЫ

Кожны дзень набліжае нас да гістарычнай даты — 24 сакавіка. У гэты дзень мільёны выбаршчыкаў вызваленых абласцей Заходняй Беларусі ўпершыню ў сваім жыцці на аснове Сталінскай Канстытуцыі будуць выбіраць сваіх дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Сталінская Канстытуцыя забяспечвае за ўсімі грамадзянамі СССР, дасягнуўшымі к дню выбараў 18 год, незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці, верапаведання, адукацыйнага цэнза, сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча і мінулай дзейнасці права ўдзельнічаць у выбарах дэпутатаў і быць выбранымі. Не маюць права голасу страціўшыя розум і асобы, якія асуджаны судом з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Ні адна буржуазная канстытуцыя ў свеце не прадастаўляе такіх шырокіх правоў насельніцтву. Буржуазныя канстытуцыі маюць у сабе ўсемагчымыя абмежаванні і ўшчамленні правоў выбаршчыкаў, у першую чаргу працоўных.

Вось, напрыклад, як выбіраўся сенат у былой панскай Польшчы. З 96 сенатараў адна трэць назначалася прэзідэнтам, астатнія „выбіраліся" асобамі не маладзей 30 год, якія мелі „асабістыя заслугі перад дзяржавай" (пілсудчыкі і асобы, узнагароджаныя ордэнамі), якія мелі вышэйшую грамадзянскую або ваенную асвету, асобы, якія ўзначальвалі розныя патрыятычныя арганізацыі. Такім чынам ад выбараў у сенат былі адхілены самыя шырокія масы. Усемагчымыя абмежаванні існавалі і пры выбарах у сейм. Узросны цэнз устанаўліваўся з 25 год. Толькі дасягнуўшыя 30 год мелі права быць выбранымі.

Але гэта толькі канстытуцыйныя абмежаванні. Акрамя гэтага пілсудчыкі, паліцыя і ўся правячая кліка перад выбарамі кідалі ў турмы сотні тысяч людзей, якія былі ненадзейнымі для памешчыкаў і капіталістаў, і такім чынам адхілялі іх ад удзелу ў выбарчай кампаніі.

Былая польская ўлада была ўладай антынароднай, таму заправілы імкнуліся, каб адхіліць значныя масы ад удзелу ў выбарах. Совецкая ўлада, наадварот, імкнецца, каб уся маса выбаршчыкаў прымала ўдзел у галасаванні, таму што совецкая ўлада гэта ўлада рабочых і сялян — сапраўды народная ўлада.

Сталінская Канстытуцыя не толькі дэкларуе вялікія выбарчыя правы для грамадзян СССР, але і забяспечвае кожнаму выбаршчыку поўнае выкарыстанне сваіх правоў. У гэтым сэнсе выключную ролю адыгрываюць спіскі выбаршчыкаў.

Згодна Палажэння аб выбарах, спіскі выбаршчыкаў павінны быць вывешаны советам дэпутатаў працоўных для ўсеагульнага агляду за месяц да выбараў. Спіскі складаюцца па выбарчых участках у алфавітным парадку, так што кожнаму выбаршчыку вельмі лёгка праверыць, ці ўключан ён у спісак выбаршчыкаў. У выпадку скажэння імя ці прозвішча, або не ўнясення таго ці іншага выбаршчыка ў спісак, выбаршчык мае права падаць заяву у совет, які складаў спіскі, а совет абавязан разглядзець кожную заяву ў трохдзённы тэрмін. Калі, выбаршчык не згодзен з рашэннем совета па яго заяве, ён мае права падаць скаргу ў народны суд. Народны суд абавязан у трохдзённы тэрмін разглядзець скаргу выбаршчыка і вынесці рашэнне, якое з'яўляецца канчатковым.

Тысячы людзей абыходзілі кварталы і кватэры гарадоў, сёл і хутароў, каб унесці ў спіскі ўсіх выбаршчыкаў. Але не выключаны памылкі, скажэнні, магчыма не ўнесены ў спіскі тыя ці іншыя выбаршчыкі. Усё гэта можна і неабходна выправіць у бліжэйшыя дні. Самі выбаршчыкі, агітатары і ўвесь выбарчы актыў павінны быць зацікаўлены, каб спіскі выбаршчыкаў былі дакладныя і поўныя. На занятках гурткоў, у гутарках на даму трэба яшчэ раз растлумачыць выбаршчыкам іх вялікія правы. Пажадана, каб выбаршчык, праверыўшы сябе ў спісках, зацікавіўся ці ўнесены члены яго сям'і, якія маюць права голасу, яго блізкія суседзі, бо ёсць прэстарэлыя, ёсць непісьменныя, якія не змогуць праверыць сябе ў спіску выбаршчыкаў.

Вялікія правы прадастаўляе Сталінская Канстытуцыя выбаршчыкам нашай краіны. Кожны выбаршчык поўнасцю скарыстае гэтыя правы. 24 сакавіка ўся маса выбаршчыкаў з'явіцца да выбарчых урнаў і аддасць свае галасы сапраўдным прадстаўнікам народа, кандыдатам блока комуністаў і беспартыйных, прадэманструе сваю любоў да сваёй роднай совецкай улады, да сваёй партыі, да свайго праваднара, свайго вызваліцеля — любімага Сталіна.

—«о»—

АПЕРЗВОДКІ ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 23 лютага на фронце не адбылося нічога асаблівага.

На Карэльскім перашэйку моцныя снежныя заносы і туман затрудзнялі баявыя дзеянні. Нашымі часцямі захоплена 12 абарончых умацаваных пунктаў праціўніка, з іх 4 жалезабетонныя артылерыйскія збудаванні.

З прычыны дрэннага надвор'я дзеянні авіяцыі абмежаваліся разведчымі палётамі.

* * *

На працягу 24 лютага на Карэльскім перашэйку моцны снегапад і туман сцяснілі баявыя дзеянні нашых войск. Нашымі войскамі занята па фронту 28 абарончых умацаваных пунктаў праціўніка, з іх 19 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў.

Нашы часці з боем занялі з добра ўмацаванымі жалезабетоннымі збудаваннямі астравы Койвісто (Бьорке), Тіурын, Саары і Пії-Саары. На астравах захоплена 22 гарматы, з іх 12 цяжкіх берагавых башанных гармат (у 10 і 6 дзюймаў), палявыя і зенітныя гарматы, вялікая колькасць танкавых кулямётаў, склады боепрыпасаў і ваеннай маёмасці.

На астатніх участках фронта без істотных перамен.

З прычыны дрэннага надвор'я дзеянні нашай авіяцыі абмежаваліся разведчымі палётамі.

РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ФАБРЫЧНАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 350

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Тупіцына Міхаіла Нікалаевіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Фабрычнай выбарчай акрузе № 350 вылучаную агульным сходам рабочых, служачых і тэхнічнага персанала тэкстыльнага камбіната № 3, на якім прысутнічала 650 чалавек, падтрыманую сходамі рабочых скуркамбінатаў №№ 1 і 2, тэкстыльнай фабрыкі № 32, кафельнага завода і іншых прадпрыемстваў і ўстаноў, падтрыманую акруговай выбарчай нарадай кандыдатуру тав. Тупіцына Міхаіла Нікалаевіча, 1906 года нараджэння, члена ВКП(б), сакратара Беластоцкага гаркома КП(б)Б, пражываючага ў г. Беластоку.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Тупіцына М. Н. ў выбарчы бюлетэнь па Фабрычнай выбарчай акрузе № 350.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі КРЫШТАФОВІЧ
Намеснік старшыні СІДАРОВІЧ
Сакратар камісіі КРАЙКО
Члены: СЦЕПАНЮК, ЦЭГЕЛЬНІЦКАЯ, ПЕТРАК, БЕЙЛІНАЎ, КРАПІВА, ШВАРЦ.

Гор. Беласток, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПРОЛЕТАРСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 352

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Пятроўскай Марыі Канстанцінаўны

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Пролетарскай выбарчай акрузе № 352 вылучаную агульным сходам рабочых і служачых 1-га тэкстыльнага камбіната, на якім прысутнічала 1.300 чалавек, падтрыманую агульным сходам рабочых плюшавай фабрыкі № 31, на якім прысутнічала 315 чалавек, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 300 чалавек, кандыдатуру тав. Пятроўскай Марыі Канстанцінаўны, 1902 года нараджэння, работніцу-прадзільшчыцу, беспартыйную, пражываючую ў вёсцы Бацечкі, Беластоцкай вобласці.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах ў Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Пятроўскай М. К. ў выбарчы бюлетэнь па Пролетарскай выбарчай акрузе № 352.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі ГАЛЕЙША
Намеснік старшыні ЛОЙКО
Сакратар камісіі КІРЫЛАЎ
Члены: КУЛІКОЎСКІ, ПЫРКО, МІРЭР, ЗАЙКОЎСКАЯ, КАРПОВІЧ.

Гор. Беласток, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 353

Аб рэгістрацыі кандыдата ў депутаты Вярхоўнага Совета БССР

Цанава Лаўрэнція Фаміча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 353 вылучаную агульным сходам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых плюшавай фабрыкі № 31, на якім прысутнічала 315 чалавек; сходам рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых тонкасуконнага камбіната № 6, на якім прысутнічала 307 чалавек, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 250 чалавек, кандыдатуру тав. Цанава Лаўрэнція Фаміча, 1900 года нараджэння, члена ВКП(б) з 1920 г., Народнага Камісара Унутраных спраў БССР, пражываючага ў г. Мінску.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Цанава Л. Ф. ў выбарчы бюлетэнь па Цэнтральнай выбарчай акрузе № 353.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі БАРТНОЎСКІ
Намеснік старшыні КРУ
Сакратар камісіі КРЫШТОБ
Члены: ЗАЙДЭЛЬ, КАТАЙЛАЎ, ШПАГІНА

Гор. Беласток, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ СЛАБАДСКОЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 355

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Прохарава Нікалая Іванавіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Слабадской выбарчай акрузе № 355 вылучаную агульным сходам рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў хлебакамбіната, на якім прысутнічала 340 чалавек, і сходамі рабочых іншых прадпрыемстваў, на якіх прысутнічала 123 чалавекі, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 350 чалавек, кандыдатуру тав. Прохарава Нікалая Іванавіча, 1907 года нараджэння, рабочага-ордэнаносца, члена ВКП(б), загадчыка ваенным аддзелам ЦК КП(б)Б, пражываючага ў г. Мінску.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР» уключыць кандыдатуру тав. Прохарава Н. І. ў выбарчы бюлетэнь па Слабадской выбарчай акрузе № 355.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі ЯСКЕВІЧ
Намеснік старшыні ОЛЬШЭЎСКІ
Сакратар камісіі ГУНЬКО
Члены: БАРАВІК, НАЙДУС, ЛАРЫЕНАЎ.

Гор. Беласток, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ТЫКОЦІНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 358

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Красніцкай Сцепаніды Іванаўны

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Тыкоцінскай выбарчай акрузе № 358 вылучаную агульным сходам работнікаў Харашчанскай бальніцы, на якім прысутнічала 903 чалавекі; агульным сходам сялян вёскі Рушаны, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 184 чалавекі, кандыдатуру тав. Красніцкай Сцепаніды Іванаўны, 1901 года нараджэння, сялянкі-бядначкі, беспартыйнай, пражываючай у вёсцы Цеснае, Беластоцкага раёна.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Красніцкай С. І. у выбарчы бюлетэнь па Тыкоцінскай выбарчай акрузе № 358.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі ФРАЛОЎ
Намеснік старшыні САДОЎСКІ
Сакратар камісіі СЕНКЕВІЧ
Члены: ЛЕЎ, САКОВІЧ, КВІЦЕЛЬ, ПАЎЛАЎ.

м. Тыкоцін, 23 лютага 1940 г.

ПАСТАНОВА

АКРУГОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ КРЫНКАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ № 376

Аб рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР

Чэкеля Уладзіміра Андрэевіча

Разгледзеўшы паступіўшыя ў акруговую выбарчую камісію дакументы аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і ўстанавіўшы поўную адпаведнасць прадстаўленых дакументаў з арт. 53 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», акруговая выбарчая камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з арт. 52 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», зарэгістраваць для балатыроўкі па Крынкаўскай выбарчай акрузе № 376 вылучаную агульным сходам сялян вёскі Кудрычы, на якім прысутнічала 165 чалавек, сходам рабочых скурзавода № 7, падтрыманую акруговай прадвыбарчай нарадай, на якой прысутнічала 120 чалавек, кандыдатуру тав. Чэкеля Уладзіміра Андрэевіча, 1906 года нараджэння, беспартыйнага, селяніна, пражываючага ў вёсцы Кудрычы.

На падставе арт. 57 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР», уключыць кандыдатуру тав. Чэкеля В. А. ў выбарчы бюлетэнь па Крынкаўскай выбарчай акрузе № 376.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі КРЭЙМАН
Намеснік старшыні КУРЦЭВІЧ
Сакратар камісіі ХАХЛОЎ,
Члены: ЛАЎРЭНЦЬЕЎ, ІГНАЦЮК, СТАПОЎНА, АНІСІМОВІЧ, НАУМОВІЧ.

Гор. Крынкі, 23 лютага 1940 г.

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ ССР І БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 598 БЕЛЬСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТА БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, ЗА ВЕРНУЮ ДАЧКУ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА, МАРЫЮ ІВАНАЎНУ ДЗ'ЯЧУК

МАРЫЯ ІВАНАЎНА ДЗ'ЯЧУК

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Глухі званок будзіў задрамаўшую ля драўлянага кухоннага стала дзяўчыну.

На велізарным старынным гадзінніку было дзве гадзіны ночы. Да раніцы, калі трэба было зноў уставаць на работу, заставалася толькі чатыры кароткіх гадзіны.

Але Марыя яшчэ і не клалася.

У поўасветленым, утульным і ціхім пакоі сядзела за картамі заўседы адна і тая-ж кампанія: сам пан, фабрыкант Трылінг, цяжка сапеушы таўсцяк, нацягнутая, густа напудраная мадам Трылінг і госці: дырэктар фабрыкі, худы, вусаты паляк, і былы рускі адмірал—белаэмігрант. Амаль кожны вечар збіраліся ігракі за картачным сталом. Яны разыходзіліся не раней, чым а трэцяй ці чацвертай гадзіне ночы. Для пакаёўкі гэта абазначала 18, а то і 20 гадзін бесперапыннай работы.

Але Марыя не скардзілася, бо пасля стольких год роспачлівай галечы, галадовак, беспрацоўя, калі прыходзілася прадаваць апошнюю коўдру,—40 злотых жалавання на ўсім гатовым!

Так працякала жыццё Марыі Дз'ячук да 1927 года. Працуючы па 16—18 гадзін у суткі, не ведаючы адпачынку, яна, нарэшце, звалілася. І варта было Марыі захварэць, як усё адразу перамянілася. Калі Марыя вярнулася з бальніцы ў дом Трылінга, яна знайшла там ужо другую, здаровую дзяўчыну. Знікла прыветлівая ўхмылка з твара мадам Трылінг.

— Марыя,—сказала мадам,—ты цяпер слабая, працаваць табе нельга. Табе трэба адпачыць...

Узрушаная такой сустрэчай, яна спускалася па ступеньках панскага ганка другім, нібы пановаму ўбачыўшым свет чалавекам. Што-ж далей? Зноў беспрацоўе, голад, галеча.

Марыя выцерла слёзы і вярнулася ў дом.

— Мадам Трылінг, як літасці прашу: устройце мяне хоць на вашай фабрыцы...

— На фабрыцы? Але-ж ты зусім слабая.

— Нічога. Калі ласка, устройце.

Мадам Трылінг накіравала Марыю к «кероўніку»— ўпраўляючаму фабрыкай.

Так Марыя Дз'ячук стала тэкстыльшчыцай. Яна зняла куток у старыка-шаўца і пачала новае жыццё. Здароўе яе не папраўлялася, стаяць ля станка было цяжка, але Марыя, цярплівая і скромная, нібы не ведала зморанасці.

Праз некаторы час яна стала заўважаць, што на фабрыцы, дзве работніцы атрымлівалі заробак арцельна з пуда пражы, пануюць дзіўныя парадкі. Работніца, якая працуе чэсна, зарабляе столькі, колькі і тыя, хто працуе мала. У «кероўніка», у майстра, у прыказчыка былі любоўніцы, якія ўхільваліся ад работы.

А калі Марыя рабіла ім заўвагі, яны нагла адказвалі:

— Ты маўчы, а не то за брамай апынішся...

І Марыя маўчала. Звярталася з фабрыкі ў сваю пастылую кануру, маўчалівая, задумлівая. «У доме ў фабрыканта я баялася толькі пані,—думала Марыя,—а тут я павінна баяцца не толькі гаспадара, майстра, «кероўніка», але і іх любоўніц...»

Прайшоў год, другі. Але вось аднойчы пазнаёмілася Марыя з чалавекам, які прыносіў кожны тыдзень жонцы шаўца бялізну для мыцця.

Замкнутасць, маўчалівасць маладой жанчыны зацікавілі гэтага чалавека.

— Чаму вы такая сумная, чаму вы ніколі не ўсміхаецеся?—запытаў ён спагадліва.

— Чаму? А чаму мне, уласна, быць вясёлай?..

Мякка, асцярожна выпытаў гэты чалавек у Марыі ўсё, пазнаў яе думы і смутак.

— Вам дапаможа чытанне. Хочаце, я буду насіць вам кнігі...

— Насіце.

Першай кнігай, якую прынёс ёй новы знаёмы, быў толькі што перакладзены на польскую мову «Цэмент» Фёдара Гладкова. За «Цэментам» паследавалі іншыя кнігі... Марыя зацікавілася жыццём у Совецкім Саюзе. Тады прыяцель стаў прыносіць ёй нелегальныя брашуры.

— Прачытайце і зараз-жа мне вярніце, нікому не паказвайце, — гаварыў ён шопатам.

Ускорасці Марыя пераехала на новую кватэру — у яе паявіўся асобны пакойчык.

— Ці можна будзе калі-небудзь зайсці да вас на кватэру



з таварышом? — запытаў знаёмы.

— Можна,—адказала Марыя.

Новыя сябры змянілі Марыю. Яна стала актыўнейшым работнікам профсаюза тэкстыльшчыкаў. Пэпэсаўскія і бундаўскія заправілы яе баяліся і ненавідзелі. Тройчы рабіла дэфензіва вобыск у яе кватэры, але нічога не знаходзіла. Аднойчы яе арыштавалі

— Мы ведаем, — пагражаў ёй афіцэр дэфензівы, — што ты працуеш у саюзе па дырэктывах комуністаў.

— Не, —адказвала Марыя,—я працую так, як падказвае мне мая класавая свядомасць...

— Выйдзі з саюза!..

— Ніколі! Я работніца і маю права быць у саюзе...

Раніцой Марыю вызвалілі.

Работніцы Беластока выбралі яе старшынёй гарадской камісіі прадзільшчыц. Так і працавала яна на фабрыцы і ў саюзе да самага прыходу Чырвонай Арміі.

На наступны-ж дзень пасля аб'яўлення вайны паміж Польшчай і Германіяй фабрыка закрылася. Работніцы засыпалі пытаннямі Марыю і яна, як магла, растлумачвала ім усё, што адбывалася. Затым настаў дзень, калі Марыя Дз'ячук сказала сваім сяброўкам:

— Пойдзем сустракаць сваіх!

Работніцы арганізавалі сустрэчу Чырвонай Арміі. Зрабілі чырвоныя сцягі, набралі кветак і пайшлі за горад на шасе. Прачакалі да абеда — Чырвонай Арміі яшчэ не было.

Страшна было звяртацца з кветкамі і чырвонымі сцягамі ў горад, дзе на некаторых дамах яшчэ віселі польскія сцягі.

— Смялей, падругі! — сказала Марыя.

І тэкстыльшчыцы рушылі назад.

Работніцы выходзілі разам з усімі грамадзянамі Беластока на Гродненскае шасе на працягу двух дзён. Пабудавалі трыумфальную арку.

Нарэшце, настаў доўгачаканы момант... З-за павароту, з-за лесу паказаліся першыя аўтамабілі з чырвонымі байцамі.

* * *

У палацы магістрата—часовае упраўленне гор. Беластока. Сюды, у велізарны старынны будынак, у якім Марыя ніколі яшчэ не бывала, запрасілі яе на наступны дзень пасля прыходу Чырвонай Арміі. Марыя крочыла па гулкаму паркету без ніякага страху.

— Ты будзеш працаваць у часовым упраўленні.

— А што я буду рабіць? Я-ж нічога не ўмею.

— Сядзі і прыглядайся. Навучышся.

Тры дні Марыя прыглядалася. Яна сядзела за сталом у адным з пакояў магістрата. Ёй даручылі прымаць фабрыкантаў. Апрануўшы святочнае адзенне, яна адпраўлялася на сваю новую работу з такім пачуццём, быццам ідзе на якое-небудзь небывалае радаснае свята. Але як толькі ўступала яна ў гэтыя суровыя, халодныя залы — адразу прыцікала. Вялікія і цяжкія справы навaліліся на яе. Спачатку яна гаварыла з прыбягаўшымі да яе запыхаўшыміся, устрывожанымі фабрыкантамі з нейкай асцярожнасцю. Але потым яе стала смяшыць іх бездапаможнасць і прагавітасць. А праз тыдзень Марыя ўжо размаўляла з імі стоячы, цяжка апіраючыся кісцямі рук на сукно вялікага стала. Погляд яе быў халодны і строгі.

* * *

Наступілі выбары ў Народнае Сабранне Заходняй Беларусі. Марыя — кандыдат у дэпутаты. Яна выступае на сходах выбаршчыкаў. Голас яе стаў нібы цвярдзей, яна гаворыць, упэўнена размахваючы рукой.

Потым — Народнае Сабранне. Марыі даручана зрабіць даклад аб нацыяналізацыі буйнай прамысловасці.

Марыя рыхтавалася к дакладу з напружаннем і ўсхваляванасцю, якіх яна не адчувала на працягу ўсяго свайго жыцця. Яна доўга хадзіла з кута ў кут, націраючы рукамі свае бледныя, упалыя шчокі. У гэтыя непаўтараемыя, незабываемыя гадзіны свайго жыцця яна ўспамінала, як выганяла яе калісьці на вуліцу мадам Трылінг, як стаяла яна, хворая, нікому непатрэбная на ступеньках фабрыканцкага дома.

У яе памяці праносіліся цяжкія малюнкі мінулага. Змучаная хранічным беспрацоўем і галадоўкамі, яна бегла аднойчы да совецкай граніцы, спрабуючы прабрацца ў краіну, дзе няма жахаў беспрацоўя. Яе арыштавалі тады і 3 месяцы працрымалі ў турме.

Паўнамоцная камісія Народнага Сабрання прыбыла ў сталіцу краіны соцыялізма. Ноччу ў гасцініцы «Москва» яна не магла заплюшчыць вачэй. Белы мрамар Крэмлёўскага зала і гул галасоў, любімы Сталін і тысячы поглядаў, поўных ласкі, прывету, любві — усё гэта паўставала перад ёй з патрасаючай яснасцю і сілай. Прыціснуўшыся да халоднага шкла вялікага акна, глядзела Марыя на начную Маскву і думала: «У сне гэта ці наяву?»...

У Беластоку, дзе перанесена столькі гора і ўніжэння, столькі радасці і шчасця — у родным горадзе — сядзіць у гэтыя лютыя зімнія дні Марыя Дз'ячук у палацы ваяводы, у пакоі, на дзвярах якога напісана: «Бюро скарг». І госцю, прыбыўшаму да яе з Масквы, яна гаворыць:

— Вы з Масквы, можа вы ведаеце: як змагацца з бюракратызмам? Я пішу, пішу запросы ў раёны, у розныя ўстановы, а мне не адказваюць. Як з гэтым змагацца?..

У руках Марыі моцна заціснутая тэлефонная трубка, вочы яе блішчаць, а на шчоках выступае чуць заметная ружовасць — здзіўлення і гневу...

І. ПАЎЛАЎ.

Героі баёў з белафінамі

„Щ-311“

Нізка плывуць цяжкія воблакі· Марасіць дождж уперамежку з мокрым снегам. Цяжка вызначыць гарызонт. Наваколл усё аднолькава шэра, зацягнута пеляной замаразі, снегу, туману...

У рубцы падводнай лодкі, пільна ўглядаючыся ўдалеч, стаіць на баявой вахце капітан-лейтэнант Фёдар Грыгоравіч Вершынін—вопытны караблевадзіцель, які адсвяткаваў нядаўна 10-годдзе свайго прабывання ў Ваенна-Марскім Флоце. Адзінаццаты год пачаўся гарачымі баявымі днямі, да якіх Вершынін—палкі патрыёт сваёй радзімы—рыхтаваў сябе даўно і ўпорна.

Перад асабістым саставам падводнай лодкі «Щ-311» Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота пастаўлена адказная і пачотная задача—знайсці і знішчыць ваенны транспарт белафінаў. З велізарнай радасцю сустрэлі маракі загад камандавання, даверыўшага ім вялікую баявую справу.

Вочы камандзіра, узброены біноклем, упіваюцца ў туман. Мора бушуе, падкідваючы на сваіх іспалінскіх хвалях баявы карабль, захлёстваючы халоднай вадой яго рубку. Салёныя пырскі ляцяць у твар: хвалі гулка грымяць па сталёваму целу судна.

У рубцы паяўляецца штурман лейтэнант Кошэлеў. Кароткі і выразны яго даклад· Камандзір лодкі аддае каманду:

— Падрыхтавацца да пагружэння!

Карабль падышоў да самага небяспечнага месца. Пачынаецца паласа мініраванай ворагам вузкасці.

Напружанасць расце з кожнай секундай. Патрэбна вялікая вытрымка, вялікае самаўладанне. Патрэбна халаднакроўе, дакладны разлік.

Прадстаўць усляпую прайсці невялікі праліў, дзе на любых глыбінях таіцца нечаканасць, падсцярагаюць небяспекі· Патрабавалася выключнае майстэрства караблевадзіцеля: раён, у якім плыла падводная лодка, добра быў вядом толькі ворагу. У экіпажа совецкага карабля не было нават вестак аб рэльефе дна, не было дастатковых даных аб сіле цячэння, аб глыбіні.

Лодка пагружалася плаўна і быстра. Чырвонафлотцы і начальствуючы састаў чотка выконвалі загады камандзіра, юдзі не спускалі вачэй са складаных прыбораў.

Увесь асабовы састаў лодкі гарэў адным жаданнем, адным імкненнем — прабіцца ў зону, куды вораг ніяк не чакаў совецкіх маракоў, дзе ён, як яму здавалася, знаходзіцца ў поўнай беспапаснасці.

Раптам шлях лодкі перагараджае нейкая перашкода· Што гэта—падводная скала ці затоплены карабль?

Камандзір загадвае павярнуць управа. Неспадзявана корпус карабля судрагаецца. Востра і трывожна адчуваецца штуршок. Маракі прыгатаваліся да ўсіх нечаканасцей. Гэта прадаўжаецца дзве-тры секунды, але яны здаюцца дзесяткамі мінут, гадзінамі.

Патрабуецца жалезная воля, цвёрдасць характара, упэўненасць, каб у такой складанай абстаноўцы не разгубіцца ні на момант, знайсці быстрае і правільнае рашэнне· Прамаруджанне або разгубленасць могуць прывесці да катастрофы, да гібелі. Захаваць у такія мінуты яснасць мыслі і дакладнасць у рабоце могуць толькі мужныя людзі, выхаваныя ў духу большэвіцкай смеласці, гарачай любві да сваёй радзімы.

З велізарнымі цяжкасцямі прабіўся падводны карабль праз вузкі праліў.

18 сутак падводная лодка «Щ-311» знаходзілася ў баявой пазіцыі. Яна дрэйфавала ў ільдах, перaадалявала жорсткія штормы, хавалася ад варожых вачэй у глыбінях мора, ішла ў пургу, абледзенявала, ператвараючыся ў айсберг. Часам немагчыма было скалваць і зрубаць тоўсты панцыр лёду, акружаўшы карабль· Тады лодка пагружалася ў глыбіню, каб там «абагрэцца», аслабаніцца ад многатоннай нагрузкі.

З выключнай дакладнасцю выконваў адважны экіпаж баявога судна загады камандзіра, складна манеўрыраваў на моры, пільна нёс сваю пачотную вахту.

— Бачу карабль праціўніка!—дакладвае камандзір мінпай баявой часці лейтэнант Сілін.

Лодка быстра пагружаецца ў ваду. На паверхні астаецца толькі перыскоп· Вершынін смела вядзе свой карабль да варожага судна. Калі адлегласць скрачаецца, калі вораг ужо блізка, лодка прыступае да выканання задання.

...Секунды—і над варожым судном падымаецца бушуючае залацістае полымя, абпаясанае густым дымам. Над морам доўга палыхае зарава, агонь пажырае тысячы тон гаручага, якім было напоўнена белафінскае судно.

Маракі падводнай лодкі «Щ-311» памятаюць і другія мінуты—мінуты, якія астануцца ў іх памяці назаўсёды...

Аднойчы паміж варожым параходам і падводным караблём завязалася гарачая артылерыйская дуэль. Вакол лодкі грымелі выстралы. Снарады падымалі вадзяныя смерчы·

Але дакладны быў гарматны разлік Сіліна і прыцэл камандора Мішчэнка. Прама ў цэль пасылалі яны снарад за снарадам.

Вораг дрогнуў. Белафінскі карабль, ахоплены полымем, паспешна і труслівa ўцякаў у свой порт. 58 мінут праследвала яго слаўная падводная лодка· За некалькі сотнь метраў ад гавані яна дабіла яго і ён грузным каменем пайшоў на дно.

Тры варожыя караблі агульнай грузападёмнасцю ў 10.000 тон знішчыў звышметкім агнём сваёй артылерыі лейтэнант Сілін.

Па ўсёй Балтыцы, па ўсяму фронту барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай грыміць слава аб падводнай лодцы «Щ-311». Яе справа сведчыць аб тым, што наш флот вырас у магутную сілу·

З іменем Сталіна на вуснах, з вобразам Сталіна ў сэрцы маракі падводнай лодкі «Щ-311» зрабілі выдатныя справы. Яны гатовы выканаць і надалей любое новае заданне свайго камандавання. Гэта сталінскія выхаванцы, выхаванцы большэвіцкай партыі, верныя сыны вялікага совецкага народа.

Капітан-лейтэнант Вершынін за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўлены пры гэтым адвагу і геройства ўдастоен звання Героя Совецкага Саюза. Ордэнамі і медалямі ўзнагароджан 41 падводнік—чырвонафлотцы і асобы начальствуючага састава гэтай лодкі.

За доблесць і мужнасць, праяўленыя асабовым саставам пры выкананні баявых заданняў камандавання, лодка ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга·

Узнагарода ўрада ў поўнай меры заслужана. У будучых баях маракі ордэнаноснай лодкі зноў увенчаць непагаснай славай чырвоны сцяг соцыялістычнай дзяржавы. (ТАСС).

ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ ПАЎСЕДЗЁННА КІРАВАЦЬ АГІТАТАРАМІ

Прадвыбарчая агітацыя ў Парэцкім раёне

Працоўныя Парэцкага раёна, як і ўсе працоўныя заходніх абласцей Беларусі, сустрэлі Указы Прэзідыумаў Вярхоўных Саветаў СССР і БССР новым уздымам палітычнай і вытворчай актыўнасці. У выбарчую кампанію ўключаюцца ўсё новыя і новыя масы працоўных. З кожным днём расце армія агітатараў, якая з чэсцю нясе словы бальшэвіцкай праўды ў шырокія масы працоўных.

Раённым камітэтам партыі створаны на ўсіх выбарчых участках агіткалектывы, кіраўнікамі якіх зацверджаны комуністы, комсамольцы і беспартыйныя актывісты з рабочых, сялян і інтэлігенцыі.

На месцах агіткалектывамі праводзіцца вялікая работа па растлумачэнню сярод насельніцтва даклада таварыша Сталіна на VIII Надзвычайным з'ездзе Саветаў, даклада аб праекце Канстытуцыі, Сталінскай Канстытуцыі і выбарчага закона. Уся растлумачальная работа праводзіцца шляхам стварэння гурткоў, замацавання агітатараў за пяцідворкамі (з прычыны хутарской сістэмы) і гутарак на даму. Такім чынам, на сёнешні дзень толькі аднымі гурткамі па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі ахоплена звыш 4 тысяч выбаршчыкаў, не лічачы выбаршчыкаў, з якімі праводзіцца работа на даму.

Агітатары знаёмяць сваіх слухачоў з перамогамі соцыялізма ў нашай краіне, з росквітам беларускай рэспублікі, гавораць аб поспехах, якіх дабіліся працоўныя заходніх абласцей Беларусі за час існавання совецкай улады. Напрыклад, кіраўнікі агіткалектываў тт. Шчэрбін, Жукавец, Шлопак, Дайнека і інш. на сваіх выбарчых участках правялі па 3—4 гутаркі з выбаршчыкамі аб соцыялістычнай і капіталістычнай выбарчых сістэмах, аб гераічнай Чырвонай Арміі, аб міжнародным становішчы. Працоўныя праяўляюць да такіх гутарак вялікі інтарэс.

За кароткі час выбарчай кампаніі ў раёне выраслі выдатныя кадры агітатараў з беспартыйных актывістаў. Такія агітатары, як тт. Пугачоўская Рая, Азёрка Александр, Гіль Галіна, Размесло Елізавета, Ількевіч Іван, Жылінскі, Бярэжная і многа іншых заняткі сваіх гурткоў наладзілі жыва, змястоўна. Яны сваёй добрасумленнай работай заваявалі сярод выбаршчыкаў высокі аўтарытэт і давер'е.

З агітатарамі, кіраўнікамі агіткалектываў рэгулярна па плану праводзяцца семінары на выбарчых участках. У сваю чаргу райком партыі праводзіць нарады па абмену вопытам работы. 19 лютага, напрыклад, праведзена раённая нарада агітатараў па пытанню аб метадах агітацыйнай работы. Нарада, на якой прысутнічала 110 чалавек, прайшла на высокім узроўні.

Аб высокім палітычным уздыме працоўных у сувязі з выбарамі ярка сведчаць праведзеныя ў раёне з 18 лютага прадвыбарчыя сходы працоўных. Процант яўкі на сходы ў сярэднім па раёну складае 85—90. Працоўныя на прадвыбарчых сходах сваімі першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Саветаў вылучылі правадыра народаў, вызваліцеля працоўных заходніх абласцей, таварыша Сталіна і яго баявых саратнікаў таварышоў Молатава, Варашылава, Калініна, Кагановіча, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Хрушчова. Працоўныя аднадушна вылучылі ў Совет Нацыянальнасцей тав. Прытыцкага, у Совет Саюза тав. Пестрака і ў Вярхоўны Совет БССР вылучан і зарэгістраван для балатыроўкі па Парэцкай выбарчай акрузе тав. Суравец Казімір Браніслававіч, 1905 года нараджэння, селянін-бядняк з вёскі Азёркі, Парэцкага раёна.

Зараз агіткалектывы разгарнулі агітацыйна-масавую работу за вылучаных і зарэгістраваных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Саветаў СССР і БССР. Уся агітацыйная работа зараз праводзіцца шляхам сустрэч кандыдатаў з выбаршчыкамі, шляхам гутарак, мітынгаў, выпускаў насценных газет на ўчастках.

Уся агітацыйна-масавая работа праводзіцца пад знакам мабілізацыі працоўных на выкананне палітыка-гаспадарчых кампаній, на падрыхтоўку да вясенняй сяўбы. У сувязі з выбарчай кампаніяй мы маем вялікі вытворчы ўздым працоўных. На станцыі Парэчча за апошні час няма ні аднаго выпадку затрымкі паяздоў, асобныя рабочыя сталі працаваць па-стаханаўску. Напрыклад, тав. Сцярэвіч, саставіцель паяздоў, ужо мае дзве падзякі ад начальніка дарогі. Калектыў чыгуначнікаў да дня выбараў узяў на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў: выканаць квартальны план пагрузкі і разгрузкі да 24 сакавіка, здаць усім дзяржтэхэкзамены толькі на выдатна і добра і г. д.

Працоўныя раёна сустракаюць дзень выбараў як усенароднае свята. У гэты дзень стопроцантнай яўкай і стопроцантным галасаваннем за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных яны прадэманструюць сваё маральна-палітычнае адзінства, сваю згуртаванасць вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол правадыра народаў, вызваліцеля працоўных заходніх абласцей Беларусі, таварыша Сталіна.

П. М. Налівайка,
загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі Парэцкага РК КП(б)Б.



На здымку: на прадвыбарчым сходзе сялян вёскі Бацюты, Беластоцкага раёна. Злева направа: Васіль Ігнатавіч Зінчук, Анна Пракоф'еўна Аніська і Анна Ільінічна Пяхоўская. (Фота-кліша ТАСС).

ПАДХАПІЦЬ ІНІЦЫЯТЫВУ СЯЛЯН ВЁСКІ БІСКОВІЦЫ

ЗВАРОТ СЯЛЯН ВЁСКІ БІСКОВІЦЫ, ВАЛКАВЫСКАГА РАЁНА, ДА ЎСІХ СЯЛЯН БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Дарагія таварышы!

Мы, сяляне-беднякі і серадняки в. Бісковіцы, Валкавыскага раёна, заслухаўшы паведамленне ўпаўнаважанага Беластоцкага абкома партыі тав. Гарошкіна аб выкананні планаў лесазагатоўкі і лесавывазкі ва ўстаноўлены тэрмін, аднадушна адабраем мерапрыемствы па выкананню гэтай выключна важнай задачы ў самы кароткі тэрмін.

Мы цалкам разумеем сваю адказнасць за гэта, што цэлы рад прамысловых прадпрыемстваў не можа нармальна працаваць з-за недахопу паліва, што школы, бальніцы і другія ўстановы гарадоў і вёсак апальваюцца з перабоямі, што рабочыя і служачыя вельмі часта не маюць дроў для апальвання сваіх кватэр. Справа лесазагатовак і лесавывазак — гэта наша родная справа.

Таварышы сяляне! Усяго некалькі месяцаў назад мы былі паднявольнымі, забітымі рабамі. Нас прыгнятаў і рабаваў хто хацеў. Сёння мы свабодныя і поўнапраўныя, атрымалі зямлю, лес, бясплатнае навучанне ў школах. Мы ўпершыню сталі гаспадарамі сваёй краіны і свайго лёсу. Гэтым мы абавязаны цалкам і поўнасцю совецкай уладзе.

Мы ўсімі сіламі павінны ўмацоўваць совецкую ўладу і рабіць усё для таго, каб жыццё ў нашых гарадах і сёлах ішло па-совецку, па-сталінску.

Мы, сяляне вёскі Бісковіцы, абавязваемся ўсе, як адзін, прымаць удзел у лесазагатоўцы і лесавывазцы, агульны план для нашай вёскі — 928 кубаметраў — давесці да кожнай хаты, арганізаваць соцыялістычную ўзаемадапамогу і ў бліжэйшыя дні з чэсцю выканаць свой доўг перад радзімай, перад совецкай уладай.

Паспяховым выкананнем планаў лесазагатовак і лесавывазак мы яшчэ раз дакажам сваю любоў да радзімы, да бальшэвіцкай партыі і да нашага бацькі, роднага тав. Сталіна.

Мы зварочваемся да ўсіх сялян Беластоцкай вобласці, каб яны наследавалі нашаму прыкладу і выканалі паспяхова план лесазагатовак і лесавывазак, увязваючы гэта з падрыхтоўкай да нашага вялікага тaржаства — дня выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

По даручэнню агульнага схода сялян вёскі Бісковіцы падпісалі:

Дэбыш Н. Г., Леанард А. О., Леанард П. І., Леанард Е. І., Круглы Ф. Ф., Ікрэмскі І. А., Нінард П. С.

* * *

Мы друкуем зварот сялян вёскі Бісковіцы да ўсіх сялян Беластоцкай вобласці. Мы ўпэўнены ў тым, што выступленне бісковіцкіх сялян знойдзе шырокі водгук сярод усіх сялян. Паспяхова вырашым важнейшую гаспадарчую і палітычную задачу — забяспечым палівам гарады і прамысловасць нашай вобласці

Нядобрасумленны агітатар

У адным з класаў школы, з цяжкасцю ўціснуўшыся ў маленькія парты, расселася 9 пажылых людзей. Яны сабраліся, каб правесці першую гутарку аб Сталінскай Канстытуцыі. Усе сабраўшыеся прышлі з аднаго дома па вуліцы Урыцкага, і гутарку было-б карысней праводзіць у якой-небудзь кватэры, у дамашняй абстаноўцы. Але агітатар участка № 39 Чыгуначнай акругі тав. Фаменка любіць вялікія аудыторыі. Ён хацеў сабраць тут, у школе, адразу ўсіх выбаршчыкаў сваіх 7 дамоў (каля 60 чалавек). Ці таму, што не ўсіх выбаршчыкаў агітатар паведаміў, ці таму, што многіх не задавальняла казённая школьная абстаноўка,—група аказалася невялікай.

Сваю гутарку тав. Фаменка пачаў з доўгага нуднага, навучальнага выступлення аб тым, што збірацца трэба акуратна, усім без выключэння, інакш ніхто нічога ведаць не будзе.

— Вы сабраліся, каб вучыцца, сказаў тав. Фаменка пажылым людзям, з якіх добрая палавіна даўно перайшла 40-гадовы ўзрост, —і калі будзеце акуратна прыходзіць, то прыдзеце падрыхтаванымі да выбараў. Можа быць, д угім і наміраць пара, а ўсёж асноўныя матэрыялы па выбарах яны павінны ведаць.

Вядома, вучыцца карысна нават у глыбокай старасці. Аднак, развязны тон, які недапусцімы ў гутарках са школьнікамі, зусім нецярпімы ў рабоце агітатара. Ніхто Фаменку не супярэчыў, але вопытны агітатар заўважыў-бы кіслую грымасу на тварах прысутных.

У тым-жа ўступным слове, гаворачы аб класавай барацьбе, у якой праходзіць выбарчая кампанія, Фаменка закрануў пытанне аб спекуляцыі, але не застанавіўся на ім, паведаміўшы, што гэта ў тэму цяперашніх заняткаў не ўваходзіць.

Далей Фаменка прыступіў к чытанню даклада таварыша Сталіна „Аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР“, прычым ні слова не сказаў, што чытаў даклад таварыша Сталіна, дзе даклад зроблен і калі. Кожны абзац даклада, абсалютна ясна вычэрпваючага тэму, зложанага пераканаўча простай сталінскай моўай, Фаменка пробаваў растлумачыць і нямала наблытаў. Так, Фаменка заявіў, што ў СССР застаўся клас рабочых, клас сялян і... **клас** інтэлігенцыі. У дакладзе таварыша Сталіна сказана зусім ясна: „Астаўся рабочы **клас.** Астаўся клас сялян. Асталася інтэлігенцыя“, але не **клас** інтэлігентаў.

Прачытаўшы адпаведнае месца з даклада аб дружбе народаў многанацыянальнага Совецкага Саюза, Фаменка хацеў паказаць нацыянальную варожасць у былой панскай Польшчы. Прыкладаў Фаменка мог-бы знайсці мноства. Каму невядома, а асабліва мясцоваму насельніцтву, бяспраўнае становішча беларусаў, яўрэяў у Заходняй Беларусі! Дастаткова было напомніць, што беларусу і яўрэю быў амаль закрыт доступ у гімназію, тым больш у вышэйшую навучальную ўстанову, што яўрэй і беларус не маглі працаваць у польскіх дзяржаўных установах. Але Фаменка чамусьці звярнуўся да арміі:

—Вы ведаеце, — казаў ён, — што ў арміі не маглі служыць яўрэі.

— Чаму не маглі? — кінуў рэпліку хтосьці з сабраўшыхся. — Служылі!

Агітатар быў сканфужан.

Зачытаўшы два першыя раздзелы даклада, Фаменка спытаў, ці ёсць пытанні. Не чакаючы адказу, ён хутка прадаўжаў:

— Пытанняў няма? Так і запішам! Мне ўсё роўна, ці ёсць пытанні, ці няма.

Калі выбаршчыкі разыходзіліся, мала чаго атрымаўшы ад гутаркі, Фаменка весела сказаў:

— Дзве гадзіны адбарабаніў зусім непрыкметна!

Як відаць, Фаменка, параўнаўшы сябе з барабаншчыкам, не пазбаўлен астраум'я і долі самакрытыкі. Сапраўды, гутарка прыпамінала барабанны бой. І нехаця паўстае пытанне, чаму партыйная арганізацыя чыгункі не пасылае сваіх прадстаўнікоў хоць-бы на першыя бяседы агітатараў, чаму не кіруе імі, чаму вылучае на адказную агітацыйную работу сярод насельніцтва непадрыхтаваных людзей?

Нельга не адзначыць, што многія партыйныя арганізацыі горада, у тым ліку і вагонныя, паслаўшы агітатараў на ўчастак, лічаць сваю місію закончанай. На нарадзе агітатараў, якая адбылася 24 лютага ў Доме партасветы, высвятлілася, што многія агітатары на радзе ўчасткаў яшчэ не прыступілі да работы. Так, на ўчастку № 7 Чырвонаармейскай акругі, па славах Крагашынскага, працуюць усяго толькі 4 агітатары. Астатнія нават не бываюць у прымацаваных да іх дамах. На ўчастку № 86 агітатару т. Цэльвікеру прапанавалі весці работу сярод 102 выбаршчыкаў, што з'яўляецца цяжкай нагрузкай. На другіх участках, напрыклад, у Дайлідах агітатары у большасці аказаліся непадрыхтаванымі.

Выбарчая кампанія ўступіла ў самы адказны перыяд агітацыі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Поспех выбараў будзе залежыць ад таго, наколькі агітатары змогуць ахапіць насельніцтва праўдзівай, яснай, талковай, бальшэвіцкай агітацыяй. Партыйныя арганізацыі павінны ўзмацніць кіраўніцтва агітацыйным калектывам, правяраючы яго работу, папраўляючы агітатараў, даючы ім кансультацыі па важнейшых пытаннях. Было-б карысным сабраць у гаркоме КП(б)Б сакратароў партыйных арганізацый, каб заслухаць іх справаздачы, як яны кіруюць агітатарамі, прапагандыстамі, актывам. Уся ўвага зараз павінна быць сканцэнтравана на агітацыйнай рабоце і на якасці агітацыйнай работы.

В. Арэф'еў.

ЯК ПРАВОДЗІЛІСЯ „ВЫБАРЫ“ Ў ПОЛЬСКІ СЕЙМ

(З сакрэтнага архіва Беластоцкага ваяводы).

Усім вядома, як у панскай Польшчы падрыхтоўваліся выбары ў карысць нянавіснага народу ОЗН. Па загаду пілсудчыкаўскіх міністраў працоўныя павінны былі галасаваць за палкоўнікаў, генералаў і фабрыкантаў, за людзей, якіх яны, наогул, не бачылі і не ведалі. Але вельмі часта нават мясцовыя прадстаўнікі ўлады не ведалі, кім з'яўляецца той, каго яны ўжо справіліся «праштурхнуць» праз акруговыя сходы і «зрабіць» кандыдатам у пасланы...

Вось адзін характэрны дакумент:

г. БЕЛАСТОК, 15/Х—38 г.

Вельмі тэрмінова — выбары

Міністэрству ўнутраных спраў, бюро па выбарах, Варшава.

Ваяводства просіць пераслаць у згодзе са штабам ОЗН персанальныя даныя адносна выбранага кандыдата ў пасланы па акрузе № 43 палкоўніка Эдварда Перковіча, невядомага па месцу жыхарства...

Панскія ўлады ведалі, як шырокія кругі насельніцтва адносяцца да камедыі выбараў на аснове пілсудчыкаўскай канстытуцыі. Вось што па гэтаму поваду піша гарадскі стараста Беластока Масочы.

г. БЕЛАСТОК, 14/Х-38 г.

Сакрэтна. Тэрмінова. Выбары.

Ваяводству.

Наогул, зацікаўленасць пытаннем выбараў можна было заўважыць выключна у кругах ОЗН. Астатняя частка грамадскасці адносіцца да выбараў з асцярогай. Ужо перад галасаваннем былі заўвагі, што яго вынік амаль вырашан кіраўнікамі ОЗН...

Але і ўнутры гэтага прагніўшага ОЗН і ўсяго пілсудчыкаўскага абоза ішла ўнутраная грызня «высокапастаўленых» дармаедаў і злодзеяў народных грошай за месца ля карыта.

Вось прыклад:

САКРЭТНА, ТЭРМІНОВА,

Міністэрству ўнутраных спраў 26/Х.—38 г.

Унутраная барацьба ў г. Гродна, пры якой праваліўся на выбарах сам Тэрлікоўскі (кандыдат ОЗН) у карысць Кшыштоня (таксама член ОЗН) паказвае пэўную ігру ваенных кругоў (генерал Ольшына, палкоўнік Пекарскі, маёр Выслаўх) разам з маладысцыплінаванымі членамі ОЗН.

Перспектывы выбараў у сенат складаюцца для ОЗН не зусім добра і залежны ад таго, ці пойдуць асобныя групы разрознена, ці вайсковыя атрымаюць адпаведны загад генеральнага інспектарата ўзброеных сіл, (Рыдз-Смiглага. Рэд.).

Але і тады, калі ўжо ўдалося правесці кандыдатаў праз акруговыя сходы, беластоцкі стараста ў пісьме ад 14/Х—38 г. вымушан прызнаць, што кандыдат у пасланы

«Антановіч Вітольд — дырэктар гандлёвай школы ў Беластоку, нацыяналістычны дэпутат гарадской рады, член ОЗН, які мае крыж заслугі, — у Беластоку мала папулярны і вялікіх шансаў быць выбраным не мае. У вёсках акругі зусім невядомы.

Ліпскі Раман — кіраўнік акруговага сакратырыята ОЗН, адзін з ягоздатных дзеячоў, прадстаўнік правага крыла, які мае крыж заслугі — у Беластоку таксама мала папулярны і вялікіх даных быць выбраным не мае.»

Усё-акі і Ліпскіх, і яму падобных «зрабілі» пасламі. Метады і сродкі былі розныя. Вось адзін з іх:

ВАРШАВА 30/Х-38 г.

ТЭРМІНОВА, САКРЭТНА.

Міністэрства прамысловасці і гандлю, пану ваяводзе Беластока.

У сувязі з распараджэннем п. прэзідэнта «Рэчпаспалітай» аб выбарах сейм і сенат, прымаючы пад увагу пункт гледжання п. прэм'ера... прашу п. ваяводу аказаць уплыў пры дапамозе падначаленых яму органаў на кругі рамеснікаў, каб яны працавалі ў карысць дзяржавы і не адмаўляліся ад удзелу ў выбарах.

Дырэктар дэпартамента.

Падначаленыя органы (паліцыя і секвестратары) «аказвалі ўплыў шляхам штрафаў, невыносных плацяжоў і рабоўніцтвам апошняй маёмасці ў бедных «ненадзейных» саматужнікаў, рамеснікаў.

Так панскія заправілы арганізавалі «выбары» ў сейм і сенат.

КАЛГАС ІМЕНІ XXII ГАДАВІНЫ РСЧА

У вёсцы Ліхасельцы, Свіслацкага раёна, арганізаван калгас імені XXII гадавіны РСЧА, які аб'ядноўвае 66 сялянскіх гаспадарак. Перад уступленнем у калгас сяляне вывучылі статут сельгасарцелі.

23 лютага адбыўся сход калгаснікаў, на якім былі выбраны праўленне калгаса і рэвізійная камісія.

Калгаснік Каліта Аляксей на сходзе заявіў: 20 год мы чакалі нашай роднай Совецкай улады. Мы зараз атрымалі магчымасць арганізаваць калгас. Перад намі зараз стаіць вялікая задача дагнаць калгасы ўсходніх абласцей БССР.

Зараз калгаснікамі вылучана спецыяльная камісія для абагулення цяглавай сілы і сельска-гаспадарчага інвентара.

Кузня калгаса прыступіла да рамонту інвентара.

Сярод калгаснікаў назіраецца вялікі ўздым: яны рыхтуюцца па-бальшэвіцку сустрэць першую совецкую вясну.

Кудраўская.

ТЭЛЕГРАМЫ

ПРЫВІТАННІ КАЛІНІНА М. І. і МОЛАТАВА В. М. У СУВЯЗІ З XXII ГАДАВІНАЙ ІСНАВАННЯ ЭСТОНСКАЙ РЭСПУБЛІКІ

У сувязі з споўніўшайся 24 лютага г. г. 22-й гадавінай існавання Эстонскай рэспублікі, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР тав. Калінін М. І. паслаў прывітальную тэлеграму прэзідэнту Эстонскай рэспублікі пану К. Пятс.

Адначасова Народны Камісар Замежных Спраў тав. Молатаў В.М. паслаў прывітальную тэлеграму міністру замежных спраў Эстоніі пану А. Пійп.

Вечар у паўпрэдстве СССР у Берліне з прычыны XXII гадавіны РСЧА

23 лютага ў Паўпрэдстве СССР у Берліне быў устроен вечар з прычыны святкавання XXII гадавіны Рабоча Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марского Флота.

На вечары прысутнічалі галоўнакамандуючы германскай арміяй генерал Браухіч, кіраўнік Вярхоўнага камандавання германскіх узброеных сіл генерал Кейтэль і рад другіх відных германскіх ваенных чыноў. На вечары прысутнічалі таксама ваенныя прадстаўнікі ўсіх замежных пасольстваў у Германіі.

Паўпрэд СССР у Германіі тав. Шкварцэў у кароткім тосце вітаў сабраўшыхся гасцей і падкрэсліў значэнне XXII гадавіны Рабоча - Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марского Флота для народаў СССР. З адказным тостам выступіў галоўнакамандуючы германскай арміяй генерал Браухіч. Ён адзначыў вялікае значэнне совецкай арміі ў мірным будаўніцтве Совецкага Саюза. Совецкая армія і флот, заявіў генерал Браухіч, вырашылі вялікія культурныя задачы. (ТАСС).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ПАЎДНЕВЫМ КІТАІ

У правінцыі Гуансі, на шасе Няньнін—Умін, кітайскія часці 21 лютага занялі некалькі пунктаў. У сектары Няньнін-Біньяп баі працягваюцца. Кітайскія войскі занялі ўсе высоты, размешчаныя паміж Сяодунам і Датанам на адлегласці звыш 30 кілометраў уздоўж шасе Няньнін-Ціньчжоу. Заняўшы гэтыя высоты, кітайскія войскі прарэзалі галоўную камуніцыю японскіх войск, па якой ішлі групіроўкі войск і снабжэнне паміж Няньнінам і Ціньчжоу.

У раёне на паўднёвы захад ад Амоя працягваюцца баі. Амаль усе войскі марыянетачнага ўрада, знаходзячыеся ў гэтым раёне перайшлі на бок кітайскага ўрада і змагаюцца супроць японцаў.

23 лютага некалькі японскіх эскадрылей бамбардыравалі горад Лючжоу (правінцыя Гуансі). Самалёты скінулі вялікую колькасць бомб, большасць якіх упала за мяжой горада, не прычыніўшы шкоды.

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

У правінцыі Цзянсі японскія войскі праводзяць рад аперацый супроць кітайскіх партызан і рэгулярных часцей у раёне чыгункі Нанкін-Уху.

У правінцыі Хунань 21 лютага кітайцы атакавалі і ў трохчасовым баі разбілі японскі атрад у пункце, размешчаным у 15 кілометрах паўночней Іочжоу, на граніцы правінцыі Хубэй і Хунань.

(ТАСС).

ДЭМАНСТРАЦЫЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ У КАПЕНГАГЕНЕ

22 лютага ў Капенгагене (Данія) адбылася вялікая дэманстрацыя беспрацоўных. У дэманстрацыі ўдзельнічала каля 16.000 чалавек. Дэманстранты неслі шматлікія транспаранты і плакаты з лозунгамі: „Хлеба!", „Работы!", „Паліва!", „Павялічце дапамогу!" і іншыя. Паліцыя забараніла дэманстрантам падыходзіць к памяшканню рыксдага (парламент), і яны накіраваліся па галоўных вуліцах горада.

На адной з плошчаў адбыўся мітынг. У сваіх выступленнях аратары гаварылі аб вельмі цяжкім становішчы беспрацоўных у Даніі. (ТАСС)

Вайна ў заходняй Еўропе

Берлін, 24 лютага. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае: «На заходнім фронце не адбылося нічога істотнага. Дзейнасць знішчальнікаў і зенітнай артылерыі была з абодвух бакоў больш ажыўленая, чым у мінуўшыя дні. Германскія самалёты зрабілі разведчыя палёты над Францыяй. Ноччу былі адзначаны палёты разведчых самалётаў праціўніка над германскай тэрыторыяй».

Берлін, 25 лютага. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміяй паведамляе: «Паміж Мозелем і Пфальцскім лесам мясцовая артылерыйская разведчая дзейнасць. Германскія самалёты патрулíравалі франка-германскую граніцу і германскую бухту. Збіты адзін англійскі і адзін французскі самалёты. Германская авіяцыя не страціла ні аднаго самалёта. У рэзультаце аперацый германскага ваенна-марского флота з пачатку вайны па 20 лютага 1940 г. уключна было патоплена 496 параходаў праціўнікаў і нейтральных краін, вёзшых грузы для саюзнікаў»

Парыж, 25 лютага. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Гавас, англійскія самалёты прабіваліся да вострава Гельгаланд, да буйнага германскага ваеннага парта Вільгельмсгафен і лёталі над пўночнымі раёнамі Германіі. У Паўночным моры англійскія самалёты атакавалі дзве германскія падводныя лодкі. У французскіх ваенных колах сцвярджаюць, што гэтыя падводныя лодкі знішчаны.

Французскія самалёты, ажыццяўляючы разведку і нагляданне, фатаграфіравалі пазіцыі праціўніка. Германскія самалёты групамі лёталі над раёнам Верхняга Эльзаса і ўздоўж швейцарскіх граніц. Яны правялі таксама вялікую колькасць глыбокіх разведчых палётаў, лётаючы і над усходнім і паўночным раёнамі Францыі аж да Парыжскага раёна. Акрамя таго, германскія самалёты ўтварылі 20 рэйдаў у напрамку англійскага ўзбярэжжа.

У вячэрнім французскім камюніке за 24 лютага гаворыцца: «Дзень прайшоў спакойна на ўсім фронце. Адзначана нязначная перастрэлка на Рэйне».

Сёнешняе ранішняе камюніке паведамляе, што «нічога істотнага на фронце не адбылося».

ВАЙНА НА МОРЫ

Лондан, 25 лютага. (ТАСС). Англійскі параход «Ройял арчэр» водазмяшчэннем у 2.266 тон затануў учора каля пабярэжжа Шатландыі, наскочыўшы на міну. Сярод выратаваных членаў каманды парахода 14 раненых.

Дацкі параход «Асе» водазмяшчэннем у 1.200 тон затануў па невядомай прычыне на шляху з Іспаніі ў Англію. Да англійскага ўзбярэжжа прыбыла выратавальная лодка, у якой знаходзіўся труп капітана парахода, а таксама моцна знясілены юнга. Астатнія члены каманды ў колькасці 15 чалавек загінулі без вестак.

Англійскі параход «Харлей» водазмяшчэннем у 400 тон падвергнуўся ў шляху нападу двух германскіх самалётаў, якія бамбардыравалі яго і абстралялі з кулямётаў.

Англійскі траўлер «Беневоліо» водазмяшчэннем у 452 тон, наскочыўшы на міну, затануў. Каманда ў колькасці 10 чалавек прапала без вестак.



На здымку: У 1-ай дзіцячай бальніцы гор. Беластока дачка тэкстыльшчыцы чатырохгадовая Люся Копелева пасля выздараўлення (Фотхроніка БЕЛТА).

ПА ГОРАДУ І ОБЛАСЦІ

ЮБІЛЕЙ СОВЕЦКАЙ КІНЕМАТАГРАФІІ

У будынку кінотэатра «Спартак» адбыўся ўрачысты сход работнікаў Беластоцкага трэста кінофікацыі сумесна з працоўнымі г. Беластока, прысвечаны 20-гадоваму юбілею совецкай кінематаграфіі.

З дакладам аб совецкай кінематаграфіі і задачах, якія стаяць перад Беластоцкім трэстам кінофікацыі, выступіў кіраўнік трэста тав. Ватыль.

Вялікая работа праароблена Беластоцкім трэстам кінофікацыі. Кінотэатры Беластоцкай обласці, якія перад прыходам Чырвонай Арміі знаходзіліся ў самым запушчаным становішчы, зараз перабудаваны і з'яўляюцца месцамі сапраўды культурнага адпачынку працоўных. Цяпер у обласці працуе 35 кінотэатраў, да канца 1940 года іх лік будзе даведзен да 123.

26 чалавек работнікаў кіно - трэста прэміраваны за паспяховую работу. Пасля схода быў прадэманстраван фільм «На граніцы».

ВОДАЛЯЧЭБНІЦА Ў БЕЛАСТОКУ

У Беластоку да гэтага часу не было водалячэбніцы. Некалькі год назад было пачата будаўніцтва водалячэбніцы, але, акрамя сцен, нічога не пабудавана.

У 1940 г. будаўніцтва водалячэбніцы будзе скончана.

На будаўніцтва адпушчана 250.000 рублёў.

ПАДРЫХТОЎКА КАДРАЎ СЕЛЬСКАГА АКТЫВА

У бліжэйшы час ва ўсіх раёнах Беластоцкай обласці будуць праведзены 15-дзённыя курсы для сельскага актыва.

Курсы кампліктуюцца з батракоў, беднякоў і серадняком, якія добра праявілі сябе на грамадскай і практычнай рабоце.

Курсы разлічаны на 1200 чалавек.

РАСЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

Падрыхтоўка да выбараў выклікала вялікі вытворчы ўздым на 4 тэкстыльным камбінаце.

Калі за пяцідзёнку з 9 па 14 лютага агульны лік удараў па ткацкаму цэху складаў 10.909.000, то з 15 па 20 лютага лік удараў пры тых-жа тэхнічных умовах дасягнуў 11.355.000.

За час з 9 па 14 лютага камбінат даў гатовага тавара 4776 метраў, а за перыяд з 15 па 20 лютага — 5123 метры.

Вырас лік двухстаночнікаў. Да 15 лютага іх было два, а на 21 лютага налічвалася ўжо 6 чалавек.

Лепшы з двухстаночнікаў тав. Нетлер за 21 лютага зрабіў 77.000 удараў на двух станках.

Адказны рэдактар Б. М. Зельманаў

СУЧАСНЫЯ ФУНКЦЫІ ЛІГІ НАЦЫЙ



(Фота-Клішэ ТАСС).

ОБЯЗАТЕЛЬНОЕ ПОСТАНОВЛЕНИЕ
Городского Исполнительного Комитета г. Белостока.

о регистрации легкового и ломового гужтранспорта, принадлежащего частным владельцам, проживающим на территории гор. Белостока.

Городской Исполнительный Комитет ПОСТАНОВЛЯЕТ:

1. Провести регистрацию всего легкового и ломового гужтранспорта, принадлежащего частным владельцам, проживающим на территории гор. Белостока с 24 февраля по 28-е февраля 1940 г.
2. Обязать частных владельцев ломового и легкового гужтранспорта при регистрации пред'явить паспорт лошади и номер, выданный б. магистратом.
3. Регистрация производится в помещении Городского Исполнительного Комитета, комната № 33, с 10 часов утра до 4 часов вечера (по моск. времени) по ул. Красноармейской, № 21.
4. Регистрацию легкового и ломового гужтранспорта возложить на городской отдел коммунального хозяйства.
5. Виновные в нарушении этого обязательного постановления привлекаются к административной ответственности штрафу до 100 рублей или принудительным работам до 14 дней.
6. Наблюдение за выполнением этого обязательного постановления возложить на Белостокский отдел коммунального хозяйства и РК Милиции.

Это постановление входит в силу через семь дней после его опубликования.

Председатель Городского Исполнительного Комитета СЕНКЕВИЧ
Отв. секретарь Городского Исполнительного Комитета ОКУНЬ

г. Белосток, 20 февраля 1940 г.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 210.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.